


# Уладзімір Ліпскі.
# «Грошык і таямнічы Кошык. Азбука фінансавай граматнасці ад Беларусбанка»

Кніга з’явілася на свет дзякуючы намаганням рэдакцыі часопіса «Вясёлка», «Беларусбанка» і выдавецтва «Адукацыя і выхаванне». На працягу двух гадоў у «Вясёлцы» друкаваліся казкі, загадкі, рэбусы, разважанні над беларускімі народнымі прымаўкамі і выслоўямі па тэме фінансаў, а потым усё гэта было сабрана пад адной вокладкай у вельмі карыснае выданне пад назвай «Грошык і таямнічы кошык».

Яе герой — Грошык, ён знаёміць дзяцей са сваімі прыгодамі ў Краіне грошай. Там праводзяцца займальныя фінансавыя ўрокі, складаецца грашовая энцыклапедыя. Грошык дапамагае маленькім чытачам разабрацца ў складаных фінансавых пытаннях (напрыклад, што такое сямейны бюджэт, бізнес, банкаўская картка).

Гэтая кніжка з’яўляецца своеасаблівай азбукай фінансавых ведаў. Дзякуючы ёй, падрастаючае пакаленне будзе разумець нюансы фінансавай дзейнасці, з якой абавязкова давядзецца сутыкнуцца ў жыцці. Нездарма ў падзагалоўку выдання значыцца: «Азбука фінансавай граматнасці ад "Беларусбанка"».




